# Тэрыторыя персанальнай адказнасці.

Захавальнікам нашага жывога багацця сёння можа стаць кожны — было б, як кажуць, жаданне.

Генеральная Асамблея ААН абвясціла 2010 год Міжнародным годам біялагічнай разнастайнасці нездарма — наша родная планета "сірацее", губляючы розныя віды жывёл і рэслін. Безумоўна, можна спаслацца на тое што далёка не кожны з нас эколаг ці біёлаг. Але заўжды ёсць шмат варыянтаў зрабіць рэальны ўнёсак у вырашэнне праблемы захавання біяразнастайнасці. Не трэба кідацца спасаць увесь сусвет — станьце захавальнікам канкрэтнай тэрыторыі, якая знаходзіцца побач.



## Асаблівы статус

У нашай краіне "ахоўныя граматы" выпісаны значнай колькасці каштоўных тэрыторый, каб захаваць у іх саміх, і біялагічную разнастайнасць. Дарэчы, яны так і называюцца — асоба ахоўваемыя прыродныя тэрыторыі (ААТТТ). Гэты статус маюць запаведнікі, нацыяналыныя паркі, заказнікі, помнікі прыроды. Акрамя таго, некаторым турыторыям надаецца дадатковы статус, які пазначае іх асаблівую вартасць. Напрыклад, тэрыторыя можа мець выключнае значэнне для захавання птушак.

У 1980-х гадах па ініцыятыве міжнароднай прыродаахоўнай асацыяцыі Birdlife International у розных краінах пачала рэалізоўвацца міжнародная праграма Important Bird Ateas (IBA) — па вылучэнні тэрыторый, важных для птушак (ТВП). Як вынікае з самой назвы праграмы. яма накіравана на выяўленне і захаванне тэрыторый, якія маюць важнае значанне для жыцця птушак. Зараз у ёй удзельнічаюць больш за 170 краін, у якіх вылучана звыш 13 тысяч ТВП — гэта месцы гнездавання, міграцый і зімовак птушак.

Беларусь далучылася да гэтай праграмы ў 1996 г дзе, і ў нас ужо налічваецца 42 ТВП, неўзабаве з'явіцца новыя. Большасць з іх адносіцца да водна-балотных угоддзяў: верхавыя і нізінныя балоты, натуральныя поймы рэк, паплавы, леса-балотныя комплексы. Стварэннс ТВП дае падставы для ўсталявання на іх ахоўнага рэжыму, правядзення прыродаахоўных мерапрыемстваў, што вельмі важна для захавання не толькі птушак, але і біяразнастайнасці ўвогуле.

## У сетцы сяброў

Выяўленнем ТВП і назіраннем за імі ў Беларусі займаецца грамадская арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны" (АПБ). З 2009 года яна пачала выконваць праекты па стварэнню і развіццю сеткі захавальнікаў ТВП. Гэтыя праекты накіраваны па прыцягненне грамадскасці да актыўнага ўдзелу ў прыродаахоўнай дзейнасці. Пачатак быў пакладзены сумесным праектам АПБ і шведскага арніталагічнага таварыства SOF, у выніку якога знойдзены захавальнікі для чатырох ТВП: "Балота Ельня", "Балота Званец", "Гарадзенская Свіслач" і "Налібоцкая пушча". Падчас выканання праекта было надрукавана шмат артыклаў у мясцовых і рэспубліканскіх СМІ а інфармацыяй пра каштоўнасць і значнасць пэўных тэрыторый для захавання біяразнастайнасці, праведзены шэраг семінараў. Упершыню ўсталяваны аншлагі, назначаючыя межы ТВП і інфармуючыя пра асаблівы статус тэрыторыі.

## Стань адным з першых!

ТВП ёсць у розных кутках Беларусі, у тым ліку і ў месцах, куды не вельмі проста трапіць. Гэта замінае навукоўцам, супрацоўнікам дзяржаўных прыродаахоўных арганізацый і АПБ настаянна сочыць за імі. Захавалынкі ж, якія жывуць на ТВГГ або рэгулярна там бываюць, могуць "прыглядаць" за сваей тэрыторыяй і весці

пастаянны маніторынг: вызначаць негатыўныя тэндэнцыі, якасць месцаў пражывання і колькасць асобных відаў птушак і г.д. Своечасова атрымалая інфармацыя дазваляе аператыўна рэагаваць на змены стану экасістэм ТВП. Акрамя таго, такія людзі аказваюць значную дапамогу ў экалагічнай адукацыі мясцовага насельніцтва. Найбольш актыўныя захавальнік могуці удзельнічаць у рэалізацыі планаў кіравання тэрыторыямі, практычных мерапрыемствах па захаванню месцаў пражывання птушак.

АПБ працягвае развіццё існуючых груп захавальнікаў і стварае іх на новых тарыторыях. У шчыльным супрацоўніцве з Літоўскім арніталагічным таварыствам (LOD) пры фінансавай падтрымцы Nordic Council of Ministers, а таксама The Coca-Cola Foundation грамадская арганізацыя "Ахова птушак Бацькаўшчыны" ажыццяўляе праект на ТВП. дзе ўжо створаны першапачатковыя групы захавальнікаў ("Балота Ельня", "Балота Званец", Гарадзінская Свіслач", "Налібоцкая пушча"). Да гэтых тэрыторый дададзены новыя: "Сэрвач", "Сярэдняя Прыняць", "Балота Спораўскае", "Выганашчанскае". Дзейнасць па стварэнню сеткі захавальнікаў закране і некаторыя суседнія тэрыторыі, размешчаныя непадалёку ад ТВП і якія таксама прымаюць удзел у праекце. Сярод іх — "Цікіны астравьт" і "Галубіцкая пушча".

У будуым кожная беларуская ТВП будзе мець сваіх заханальнікаў, а ў вас ёсць магчымасць стаць адным а першых ужо сёння!

***Вольга ЛУКШЫЦ,***
***спецыяліст АПБ па стварэнні***
***сеткі захавальнікаў ТВП***

**Источник:** Родная прырода.-2010.-№ 4.-С.14-15.



**Захавальнікі ТВП "Балота Ельня"** *(злева направа)* **І.КАСНЕВІЧ і А.КЛЯШЧОНАК ацэньваюць ураджай журавін на балоце разам з дырэктарам ДПУ "Ельня" П.БАГАЛЕЕМ**